# Другія Тышкевіцкія чытанні ў Лагойску





16 кастрычніка на базе Лагойскага гістарычна-краязнаўчага музея імя К. і Я. Тышкевічаў прайшла абласная навуковая канферэнцыя – "Другія Тышкевіцкія чытанні". А дзесятай гадзіне ўсе ўдзельнікі і госці канферэнцыі (супрацоўнікі раённага гістрычна-краязнаўчага музея і кафедры музеязнаўства БДУКіМ, краязнаўцы музейныя работнікі з г. Вілейкі) сабраліся на Цэнтральнай плошчы каля будынка райвыканкаму, каб урачыстым ускладаннем кветак да магілы К. Тышкевіча пачаць мерапрыемства. Затым яны наведалі знакавыя мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Тышкевічаў, а менавіта: касцёл, пабудаваны на месцы, дзе раней знаходзілася фамільная крыпта роду, царкву Св. Мікалая і цудадзейную крынічку каля яе, будынак колішняй палатнянай фабрыкі і рэшткі палаца, у якім крыху больш за паўтара стагоддзі таму размяшчаўся першы на тэрыторыі Беларусі музей.



Пасля рэгістрацыі ўдзельнікаў канферэнцыі прайшло пленарнае пасяджэнне, на якім выступілі Г. В. Драгунова, намеснік старшыні Лагойскага райвыканкаму, А. І. Смолік, загадчык кафедры культуралогіі БДУКіМ, і П. А. Вабішэвіч, начальнік аддзела культуры Лагойскага райвыканкаму. Пасля "кававай хвілінкі" ўдзельнікі канферэнцыі разышліся па секцыях (іх было дзве – гісторыі і археалогіі і краязнаўчая). Адпаведную атмасферу стваралі малюнкі і карціны ўдзельнікаў "Тышкевіцкага пленэру", які напярэдадні прайшоў у Лагойску.

У секцыі гісторыі і археалогіі свае даклады прадставілі С. І. Жыгунова ("Віленскі музей старажытнасцей"), І.Н. Колабава ("Нумізматычная калекцыя Лагойскага музея Тышкевічаў"), А. М. Нароўская ("Гравюры ў мастацкай калекцыі К. і Я. Тышкевічаў"), А. Я. Паўлава ("Дакументы роду Тышкевічаў"), А.А. Трусаў ("Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў"), Г. А. Карпечанка ("Канстанцін Тышкевіч і паўстанне 1830-1831 гг.").

У секцыі краязнаўства вялікую цікавасць выклікалі даклады І.І. Бамбешкі "Экспедыцыйнае даследаванне Лагойшчыны ў 1923 г." і М.М. Петуха "Вялля – крыніца жыцця", якія суправаджаліся паказам слайдаў, а таксама паведамленне М. М. Міхалевіча і В. М. Кастэнкі "Корчмы ў кнізе К. Тышкевіча "Вілія і яе берагі" (на жаль, В.М. Кастэнка па трагічнай выпадковасці не дажыў да канферэнцыі, у якой так хацеў узяць удзел).

Кожны з удзельнікаў мерапрыемства атрымаў на памяць карту Лагойскага раёна і буклет, сувенір у выглядзе званочка з надпісам "Лагойск – 2009", праграмку і, выдадзены кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУКіМ спецыяльна да гэтага дня, асобнік зборніка "Другія Тышкевіцкія чытанні".

Завяршылася канферэнцыя круглым сталом, на якім было вырашана наступныя, ужо трэція, "Тышкевіцкія чытанні" правесці ў Вілейцы. Арганізатары канферэнцыі выказваюць шчырую ўдзячнасць усім яе ўдзельнікам і спадзяюцца, што мерапрыемства запомнілася атмасферай добразычлівасці і даследчыцкага азарту.


*Дзіна Рамадзіна,*
*ст. навуковы супрацоўнік Лагойскага гістарычна-краязнаўчага музея імя К. і Я. Тышкевічаў.*